Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

№ 13 (358) | Субота, 28 сакавіка 1959 года | Цана 20 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

- Парадак будзе забяспечаны! 1 стар.
- Чытач працягвае размову 2 стар.
- Першы крок зроблены 2 стар.
- Гогалеўскія традыцыі ў беларускай літаратуры. 3 стар.
- Па шляху майстэрства 4 стар.

НА ЗДЫМКУ: каменшчык Мікалай Шабуня працуе на будаўніцтве інтэрната. Штодзённа ён выконвае норму на 120—130 працэнтаў. Фота М. Гусака.

ПАРАДАК БУДЗЕ ЗАБЯСПЕЧАНЫ!

(ЦК ВЛКСМ аб удзеле камсамольцаў у ахове грамадскага парадку ў краіне).

ЦК ВЛКСМ разгледзеў пытанне аб рабоце камсамольскіх арганізацый у сувязі з пастановай Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб удзеле працоўных у ахове грамадскага парадку ў краіне». За апошнія гады многія камсамольскія арганізацыі краіны накапілі значны вопыт барацьбы з парушальнікамі грамадскага парадку. У брыгадах садзеяння міліцыі, добраахвотных атрадах працуюць дзесяткі тысяч лепшых камсамольцаў і моладзі. На прадпрыемствах, пры райкомах і гаркомах камсамола паспяхова дзейнічаюць камсамольскія штабы, вялікае распаўсюджанне атрымалі розныя формы ўздзеяння на парушальнікаў грамадскага парадку: фотавітрыны, вокны сатыры, «кракадзілы» і г. д.

Надаючы важнае значэнне ўзмацненню ролі камсамольскіх арганізацый у рабоце па ахове грамадскага парадку ў краіне, ЦК ВЛКСМ абавязаў ЦК ЛКСМ саюзных рэспублік, крайкомы, абкомы, гаркомы, райкомы камсамола забяспечыць актыўны ўдзел камсамольскіх арганізацый у стварэнні добраахвотных народных дружын.

Гаркомам, райкомам камсамола, пярвічным камсамольскім арганізацыям прапанавана рэкамендаваць у добраахвотныя народныя дружыны і раённыя (гарадскія) штабы па ахове грамадскага парадку лепшых камсамольцаў і актывістаў, дастойную, смелую і самаадданую моладзь, якая станоўча зарэкамендавала сябе па месцы сваёй работы і жыхарства. Работу камсамольцаў у добраахвотных народных дружынах трэба разглядаць як адно з важных камсамольскіх даручэнняў. Члены ВЛКСМ павінны служыць прыкладам у выкананні задач, ускладзеных на добраахвотныя народныя дружыны. Камсамольскія арганізацыі абавязаны штодзённа весці работу сярод дружыннікаў, аказваць ім неабходную дапамогу і садзеянне ў бездакорным выкананні ўскладзеных на іх абавязкаў, а асабліва вызначыўшыхся—заахвочваць.

ЦК ВЛКСМ абавязаў камсамольскія арганізацыі правесці шырокую растлумачальную работу сярод камсамольцаў і моладзі аб мэтах і задачах добраахвотных народных дружын па ахове грамадскага парадку, сумесна з аддзяленнямі таварыстваў па распаўсюджанню палітычных і навуковых ведаў шырэй практыкаваць правядзенне лекцый, дакладаў, гутарак па пытаннях камуністычнай маралі, савецкага права, захавання правіл сацыялістычнага агульнажыцця, арганізоўваць выступленні перад моладдзю работнікаў пракуратуры, народных суддзяў, органаў міліцыі.

Галоўным павінна з'яўляцца паляпшэнне ідэйна-выхаваўчай работы ў кожнай пярвічнай камсамольскай арганізацыі. Абавязак камсамольскіх арганізацый штодзённа выхоўваць у юнакоў і дзяўчат уменне жыць і працаваць па-камуністычнаму, больш актыўна ўцягваць моладзь у культурна-масавыя і спартыўныя мерапрыемствы, прымаць неабходныя меры па прывіццю навучэнцам, студэнтам і моладзі цвёрдых навыкаў захавання дысцыпліны і правіл у школе, навучальнай установе, у сям'і, на вуліцы і грамадскіх месцах, ствараць атмасферу нецярпімых адносін да тых, хто дапускае антыграмадскія ўчынкі, абмяркоўваць іх на сходах, крытыкаваць у друку, усімі сіламі вяртаць на правільны шлях маладых людзей, якія трапілі пад дурны ўплыў, і, калі гэта не дапамагае, дабівацца прымянення да злосных парушальнікаў грамадскага парадку мер адміністрацыйнага ўздзеяння.

Камсамольскія газеты і часопісы закліканы ярчэй расказваць аб смелых і высокародных учынках юнакоў і дзяўчат, аб лепшым вопыце работы добраахвотных народных дружын па ахове грамадскага парадку. Маладзёжны друк, насценныя, сатырычныя газеты, агітбрыгады павінны вастрэй выступаць супраць хуліганаў, п'яніц, узнімаць камсамольцаў і моладзь, грамадскасць на барацьбу з парушальнікамі правіл сацыялістычнага агульнажыцця.

РЭПАРТАЖ

ПЕРШАКУРСНІКІ

КОЖНЫ ГОД дзверы нашага універсітэта шырока адчыняюцца перад тым, хто ідзе сюды вучыцца пасля некалькіх гадоў працы на заводах, на будоўлях. Сярод іх нядаўнія токары, каменшчыкі, калгаснікі, былыя воіны Савецкай Арміі.

Аб іх, цяпер ужо студэнтах нашага універсітэта, пойдзе ніжэй размова.

...Мне параілі зайсці да першакурснікаў юрыдычнага факультэта. Там, маўляў, ёсць такія героі, што хоць паэму аб іх пішы. Аднойчы я загледзеў да іх у інтэрнат па вуліцы Кірава.

...акой № 6 ...Адразу ж кінулася ў вочы чысціня, парадак. Ва ўсім адчуваецца гаспадарчая рука, акуратнасць. Хлопцы рыхтаваліся да заняткаў. Я пазнаёміўся.

— Мяне завуць Эдуард Кампіцкі..

Высокі, хударлявы, ён моцна паціскае мне руку сваёю, відаць бачыўшую ні адзін раз мазоль. Мы разгаварыліся.

— Да паступлення ва універсітэт я працаваў вось тут, у Мінску, у СМУ-3, трэста Саюзтэлефонстрой манцёрам-працяжнікам.

Работа не складаная, але цікавая, і мне вельмі спадабалася.

Але не гэта асноўнае ў яго расказе. Заслугоўвае ўвагі тое, што Эдуард за 4 гады працы ў розных установах, прадпрыемствах авалодаў не толькі спецыяльнасцю манцёра-працяжніка, але і стаў добрым токарам, слесарам, столярам. З вытворчасці ён быў прызваны ў рады Савецкай Арміі.

Адчуваецца, што юнак прайшоў сапраўдную школу жыцця, і за гэтымі сціплымі словамі аб сабе хаваецца шмат чаго вялікага і гераічнага.

Амаль аднолькавы жыццёвы шлях і ў яго сяброў, Віктара Гаеўскага і Васіля Сямёнава. Віктар быў рабочым будтрэста, а Васіль прыйшоў на першы курс з Савецкай Арміі.

Колькі іх, вось такіх простых хлапцоў, працуе ў розных кутках нашай Радзімы, робячы сваю, быццам звычайную справу, з якой вырастае потым наша цудоўная рэчаіснасць.

Вось у такой зайшоў яшчэ адзін юнак. Гэта Фёдар Салановіч, моцны каржакаваты хлапец, з добрай усмешкай у вачах.

Даведаўшыся, што мяне цікавіць, ён адразу пасур'ёзнеў. Сапраўды, было што ўспомніць, аб чым пагаварыць. Семнаццацігадовым юнаком прышоў на Мінскі аўтамабільны завод з рамеснага вучылішча. Працаваў слесарам. Вядома, спачатку прыглядаўся да ўсяго, стараўся ўнікнуць усюды, зразумець усё. На заводзе ж скончыў школу рабочай моладзі... Потым служба ў Савецкай Арміі, і зноў любімы завод. Яшчэ і цяпер у Фёдара захаваліся аб ім самыя лепшыя ўспаміны. Ды і як можна забыць тых людзей, якія раскрылі перад ім так многа новага, невядомага. Фёдар добра памятае Сцяпана Гаўрылавіча Барсукова, свайго майстра, старога камуніста. Гэта ён па-бацькоўску клапатліва сачыў за тым, каб такія вось, як Фёдар, змаглі палюбіць сваю справу, знайсці сваё месца ў жыцці.

Не сатруцца ў памяці і тыя хвіліны, калі яго, лепшага маладога металіста цэху, прымалі ў партыю. Як ён тады быў узрушаны, усхваляваны! Хацелася абняць гэтых добрых, з цёплай усмешкай людзей, якія так давяралі яму, чалавеку, які вырас, вучыўся на заводзе, сярод іх. Хацелася рабіць, вынаходзіць штосьці новае, вялікае.

Амаль 6 год ён працаваў на заводзе. Моцна палюбіў яго, і калі прышлося развітацца з сябрамі, нейкая горыч на момант сціснула грудзі, падкацілася да горла.

А потым насталі дні вучобы. Нялёгка цяпер Фёдару. Шмат што забыў, усё патрэбна пачынаць спачатку. Але Фёдар Салановіч не з такіх, хто скардзіцца на сваю долю. Разам з Эдуардам Кампіцкім, разам з Віктарам Гаеўскім і Васілём Сямёнавым, разам з усімі, хто добра ведае, што такое праца, упартасць, мэта, ён змагаецца, замагаецца за веды. І вынікі ўжо нядрэнныя. Першая ў жыцці студэнцкая сесія здана толькі на «добра» і «выдатна».

Такія яны, нашы першакурснікі.

А. ПАДБЯРОЗНЫ.

Студэнт І курса фізфака Дзімітры Сагайдак, былы рабочы, працуе за такарным станком.

ХУТКА ЛЕТА

Набліжаецца лета—жаданая пара канікулаў. Многія студэнты паедуць на курорты і санаторыі ці адправяцца ў турысцкія падарожжы.

У красавіку, маі многія нашы студэнты пабываюць у дамах адпачынку. Тыя, каму неабходна лячэнне, паедуць у санаторыі на Поўдзень і ў Прыбалтыку. У чэрвені, ліпені, жніўні студэнты змогуць пабыць на экскурсіях у Маскве, Ленінградзе, Кіславодску, Геленджыку. Пуцёўка даецца на 10 дзён і каштуе 120 рублёў. У Сочы—15 дзён, кошт—180 рублёў.

Экскурсанты забяспечваюцца інтэрнатам. Праезд аплачваюць самі. Жадаючыя могуць паехаць на два тэрміны.

Можна набыць пуцёўкі на наведванне двух гарадоў—Масквы і Ленінграда, Сочы і Сухумі.

Беларускае бюро турысцкіх падарожжаў стварае базы на возеры Нарач і Галалесе (Мінскае мора). Пуцёўка на 10 дзён каштуе 250 рублёў.

А. ШЧАРБАЧЭНЯ, старшыня аздараўленчай камісіі прафкома.

НАШ ШЛЯХ—ПРАЦАВАЦЬ І ВУЧЫЦЦА

У сувязі з перабудовай вышэйшай школы ў бягучым навучальным годзе ва універсітэце адкрылася вячэрняе аддзяленне на радзе факультэтаў.

Пасля працоўнага дня на вытворчасці рабочыя і служачыя спяшаюцца запаўняць кабінеты, лабараторыі і аўдыторыі універсітэта. Працаваць і вучыцца—вось шлях, які яны выбралі. Спалучаць работу на вытворчасці з паспяховай вучобай ва універсітэце нялёгка. Але такія студэнты, як слесар Мінскага аэрапарта Е. І. Рулідa, слесар-пірамітрыст Г. В. Туманаў, сакратар фізічнага аддзялення В. П. Штампель і другія ўжо даўно навучыліся берагчы кожную мінуту працоўнага часу. Усе яны закончылі школы рабочай моладзі, ведалі, што працаваць і вучыцца ва універсітэце—нялёгка, але яны не спалохаліся цяжкасцяў. У нас устанавілася добрая традыцыя дапамагаць адстаючым у вучобе. Напрыклад, такія студэнты, як звыштэрміновы А. Я. Смірноў і лабарант фізфака К. Сабіла заўсёды ахвотна растлумачаць таварышу незразумелы імі матэрыял.

Але, нажаль, у нашай вучобе ёсць многа перашкод арганізацыйнага характару. Да гэтага часу, напрыклад, у нас няма пастаяннай аўдыторыі, і мы кожны дзень вымушаны па некалькі разоў пераходзіць з адной аўдыторыі ў другую. Такія «перакачоўкі», безумоўна, аднімаюць многа дарагога вучэбнага часу і перашкаджаюць паспяховай рабоце.

Будзем спадзявацца, што адміністрацыя вячэрняга аддзялення створыць нам нармальныя ўмовы для вучобы.

П. ЗАЙЦАЎ, студэнт І курса вячэрняга аддзялення фізікі.

ЗАМЕСТ АГЛЯДУ ДРУКУ

АБ ГЭТЫМ НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ

Нялёгка выпусціць цікавы, змястоўны нумар насценгазеты. Але ніхто не стане сцвярджаць, што для гэтай справы патрэбны асобыя таленты. Важна, каб рэдкалегія і звязаныя з ім вышэйстаячыя органы лічылі насценны друк дзейсным сродкам уздзеяння на студэнцкую моладзь.

«У камунізм мы не возьмем хулігана», сказаў тав. М. С. Хрушчоў. І хоць непрыемна гаварыць пра такіх «тыпаў» у сценах універсітэта, але далей маўчаць нельга. Бо нельга спакойна чытаць загады рэктара аб выключэнні некаторых студэнтаў за дрэнную паспяховасць і амаральныя паводзіны. Чаму ж так здараецца, што чалавек, дайшоўшы амаль да канца 5 курса, выключаецца з універсітэта?

Адказ на гэта можна прачытаць у заметцы І. З. Фішэра ў лютаўскім нумары насценгазеты фізічнага факультэта «За навуку» (рэдактар Неменман). Ён піша пра свае ўражанні ад камсамольскага сходу, які адбыўся 10 студзеня г. г. І з поўным правам дацэнт называе гэты сход «кірмашом», на якім «студэнты вялі сябе нахабна, імкнучыся абяліць выпадак хуліганства некалькіх аднакурснікаў, а выступленне камуніста Лепчанкі было дэмаралізуючым». Гэтыя словы сведчаць аб тым, што камсамольская і прафсаюзная арганізацыі, якія павінны быць школай камунізма, недастаткова выконваюць свае абавязкі па выхаванню моладзі. У выніку такога становішча ў некаторых студэнтаў паяўляюцца лёгкадумныя наплявацельскія погляды на вучобу, грамадскія абавязкі. А таварыскія адносіны на чым грунтуюцца? Нездаровая атмасфера ў студэнтаў-фізікаў: арганізаваныя насмешкі над асабовымі якасцямі аднакурсніка Савасцея, пагрозы старшыні студсавета, праклянне перад «героямі» п'янкі і дэбоша. І ўсё гэта замест таго, каб чэснай, цвёрдай рукой стрымаць памыліўшагася або распасаўшагася таварыша.

З малога пачынаецца вялікае, і, як вядома, не за першы, не за якісьці там нікчэмны праступак выключаны трэцякурснік фізічнага факультэта Гіль.

Па заметцы студэнтаў Івахнік і Корзун можна меркаваць, што такі ж лёс чакае і гультаёў Жордачкіна, Берзіна, якія атрымалі па дзве нездавальняючыя адзнакі на экзаменах.

Вялікую выхаваўчую дзейнасць мае гэты нумар «За навуку», бо ў ім бязлітасна бічуюцца нездаровыя праявы на факультэце.

Усебакова, глыбока і своечасова адлюстроўвае жыццё біялагічнага факультэта насценгазета «За мічурынскую біялогію». Між іншым, яна адкрыта, смела крытыкуе такіх нераозвых студэнтаў, як Бачыла (чэмпіён III-га курса па правалах на экзаменах: тры «нездавальняюча»), альбо Жолтак, якую даўно ўжо ´не бачылі на занятках ва універсітэце. Са старонкі насценгазеты гучыць голас усеагульнага, грамадскага асуджэння нядобрасумленнасці гультаяватых студэнтаў, патрабаванне прымянення да іх рашучых мер, каб не выраставалі сярод працоўнага студэнцтва пустацветы.

Нажаль, такой вастрынёй і сілай не валодаюць газеты другіх факультэтаў і, у першую чаргу, орган матэматычнага факультэта «Рашым любую задачу». Нягледзячы на многаабяцаючую назву у гэтай насценгазеце знойдзем больш «вадзіцы», чым фактаў, змест куцы і павярховы ад перадавой да самай апошняй заметкі. Чаму Чабатарова, Лапко і другія атрымалі «нездавальняюча» на экзаменах? Можа дрэнна наведвалі заняткі, ці на занятках спалі,—аб гэтым не сказана, не вымаўлена горкага, але праўдзівага слова людзям з «хвастом».

Есць тут і сатыра, толькі без прамога адрасу; яна амаль не кранае, не коле вока таму, хто яе заслужыў. Адсюль і атрымоўваецца, што «Рашым любую задачу» пакуль што малаайтарытэтная насценгазета, рэдкалегіі яе яшчэ трэба многа зрабіць, каб рашыць задачу ліквідавання недахопаў у вучобе і жыцці студэнтаў.

П. КРЫВАНОЖАНКА

Нашы таварышы

ЯШЧЭ будучы ў школе Тамара Харэбава палюбіла хімію. Ёй падабалася доўгі час вазіцца з рэактывамі, праводзіць вопыты. Яна з вялікім захапленнем вывучала любімы прадмет і рашыла абавязкова стаць хімікам.

Зараз Тамара—студэнтка II курса хімічнага факультэта. Паспяховая вучоба не перашкаджае ёй у свабодны час займацца ў секцыі мастацкай гімнастыкі і весці шэфскую работу ў школьным хімічным гуртку.

НА ЗДЫМКУ: Тамара Харэбава ў лабараторыі якаснага аналізу рашае кантрольную (прафесарскую) задачу.

Фота Г. ПРАВАЛОВІЧА.

Чытач працягвае размову

Пазбаўляць і звычайнай стыпендыі

ПРАЧЫТАЎШЫ заметку прафорга філфака Філончыка ў № 9 газеты «Беларускі універсітэт», я не адразу згадзіўся з аўтарам. Але па сталай думцы я прыйшоў да вываду, што Філончык правы.

Характэрнымі рысамі перадавога савецкага чалавека з'яўляюцца высокая камуністычная ідэйнасць, свядомасць, працоўная актыўнасць. Там, дзе патрабуецца яго ўменне, навык, уласцівае толькі яму індывідуальнае прафесіянальнае майстэрства, ён не замарудзіць аддаць іх грамадству, кіруючыся пры гэтым не асабістай выгадай, а высокімі прынцыпамі камуністычнай свядомасці.

Тыя ж асобы, аб якіх ідзе размова ў заметцы Філончыка, не поўнасцю адпавядаюць гэтым якасцям. Таму і заахвочваць іх няварта.

Яны—людзі-спажыўцы, што ўсё бяруць ад грамадства, але нічога не даюць узамен, а гэта рэзка супярэчыць маральнаму абліччу савецкага студэнта.

Мне могуць запярэчыць, што асноўная наша задача—вучыцца, прытым добра, накопліваць веды, каб па заканчэнню ВНУ прымяніць іх у жыцці. Сапраўды, наша задача вучыцца, але не толькі пэўным дысцыплінам. Нам трэба вучыцца і жыць у грамадстве, паважаць яго інтарэсы, быць карыснымі яму.

Калі ж чалавек свядома ўхіляецца ад сваіх грамадскіх абавязкаў, а тым больш, калі ён парушае правілы сацыялістычнага агульнажыцця, грэбуе калектыўнымі інтарэсамі, такіх асоб трэба пазбаўляць не толькі павышанай, але і звычайнай стыпендыі.

В. ЯНКОЎСКІ.

Ісці ў нагу з калектывам

У сваім пісьме ў рэдакцыю «Выдатнік, грамадскія абавязкі і стыпендыя» Г. Філончык піша аб тым, якім павінен быць выдатнік. На мой погляд, пісьмо правільнае. Той студэнт, які ўхіляецца ад удзелу ў грамадскім жыцці, замыкаецца ў вузкім коле толькі сваіх інтарэсаў, не можа быць сапраўдным выдатнікам. Такі вось выдатнік ужо цяпер робіць памылку. А што будзе ён рабіць, калі пасля заканчэння універсітэта выйдзе на самастойны шлях? Няўжо ён будзе навучаць другіх адгараджвацца ад людзей, ад жыцця так, як ён робіць сам?

Нажаль, такія вось выдатнікі яшчэ існуюць паміж намі. Узяць, напрыклад, студэнтку II курса філалагічнага факультэта Е. Сеўрук. Яна не ўдзельнічае ў грамадскім жыцці групы і факультэта, жыве толькі сваімі інтарэсамі. Але, нягледзячы на гэта, лічыцца выдатніцай.

Па-мойму, такі студэнт не мае сапраўднага прызвання да прафесіі, якую ён выбраў.

А. КАРАНЕВІЧ.

Першы крок зроблены

Педпрактыка. З нейкай насцярожанасцю і хваляваннем чакалі яе студэнты нашага курса.

Кожны прыкідваў, як ён зможа прымяніць тыя веды, якія набыў за тры з палавінай гады ва універсітэце. Ці змагу быць сапраўдным настаўнікам? —такое пытанне непакоіла многіх.

І вось надышлі гэтыя дні. У школу № 4 г. Мінска нас накіравалі 5 чалавек: Н. Палуян, Т. Рымкевіч, М. Стома, Е. Стральцову і мяне. Знаёмімся з класамі, уваходзім у курс школьнага жыцця. Урокі, якія мы наведалі ў час пасіўнай практыкі, далі нам вельмі многае для далейшай нашай работы. З вялікай увагай наглядалі мы за кожным рухам настаўніка ў класе, за апытваннем вучняў, тлумачэннем новага матэрыялу. Трэба ж было пераняць лепшае!

Першы заліковы ўрок. Напружана і ўважліва падрыхтоўваўся кожны да яго: прачытванне патрэбнай літаратуры, шматлікія кансультацыі з настаўнікамі і «трэніроўка» ў інтэрнацкім пакоі перад сябрамі. Але як бы добра не падрыхтаваны быў урок, кожны хваляваўся перад тым, як адчыніць дзверы класа.

З нашай групы даць першы ўрок выпала на долю Тамары Рымкевіч. Маладая настаўніца добра справілася з пастаўленай задачай. Урок прайшоў на належным узроўні. Першы крок зроблены. А па пракладзенаму следу лягчэй ісці. Значна дапамагло нам тое, што да першага заліковага ўрока мы ўжо далі па тры-чатыры незаліковых. Вялікую дапамогу нам аказалі кансультацыі, праведзеныя вопытнымі настаўнікамі А. С. Бельскай, В. П. Качанавай, І. І. Кухаравым. Пасля іх указанняў, парад нічога не заставалася няяснага ў правядзенні ўрока.

За час практыкі мы адчулі, якая адказнасць лажыцца на плечы настаўніка па выхаванню маладога пакалення. Наведванне ўрокаў у класах, выпуск насценгазет, гутаркі на розныя тэмы, дапамога адстаючым, кіно, тэатр—вось кола нашай работы.

Аказаўшыся ў ролі настаўніка, мы яшчэ раз пераканаліся, наколькі важна студэнту не толькі быць выдатнікам, але і ўмець выконваць грамадскую работу. Да настаўніка звяртаюцца за парадай не толькі дзеці, але і дарослыя. Таму студэнт—будучы настаўнік—па вінен многае ведаць.

Праходжанне педпрактыкі ў школе дапамагае нам ясней уявіць, выразней убачыць спецыфіку той прафесіі, якую мы абралі.

І. САЛАМЕВІЧ,
студэнт 4-га курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.

ЯЕ ЦІКАВІЦЬ УСЁ

Яшчэ ў сярэдняй школе № 19 горада Гомеля, дзе вучылася Люда Мірачыцкая, яе ведалі, як выдатніцу вучобы, добрую сяброўку.

Школу яна скончыла з сярэбраным медалем і ў тым жа. 1955 годзе паступіла на юрыдычны факультэт універсітэта. З таго часу прайшло амаль чатыры гады. За гэты час Люда паказала сябе толькі з лепшага боку. Яна адну за другой атрымлівае выдатныя і добрыя адзнакі на экзаменах.

Рознастайны інтарэсы Люды: кіно, тэатр, музыка, курсы кройкі.. Усё гэта цікавіць яе. У апошні час дзяўчына ўсё больш аддаецца навуковай рабоце. У мінулым годзе яна напісала пад кіраўніцтвам выкладчыка сямейнага права Алены Маркаўны Якаўлевай работу «Спрэчкі аб дзецях паміж бацькамі». На гарадскім аглядзе студэнцкіх навуковых работ яе працы прысвоена другая катэгорыя. Цяпер Люда плануе новую работу, на гэты раз па крыміналістыцы. Можна спадзявацца, што і гэта работа атрымае не менш высокую адзнаку.

НА ЗДЫМКУ: Людміла Мірачыцкая ў гасцях у сваёй сяброўкі Людмілы Міцкевіч развучвае новую песню.

Тэкст і фота Я. ЛЯХАВА.

Паседжанне СНТ

Учора ў кабінеце рэктара адбылося паседжанне Савета СНТ БДУ імя У. І. Леніна.

На парадку дня стаялі пытанні аб рабоце студэнцкіх навуковых гурткоў на філалагічным і біялагічным факультэтах (дакладчыкі: т. Самускевіч, і т. Гарашчук), аб ходзе падрыхтоўкі да студэнцкай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 89-ай гадавіне з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна (дакладчык т. Галенчанка).

На гістарычным факультэце ствараецца Музей археалогіі і этнаграфіі БССР.

На здымку (злева направа): загадчык кафедрай гісторыі БССР Л. С. Абэцадарскі, лабарант А. П. Ігнаценка, кандыдаты гістарычных навук А. Г. Мітрафанаў, А. І. Сідарэнка і М. П. Баранава за адборам экспанатаў для музею.

Старонку падрыхтавалі студэнты II курса аддзялення журналістыкі: Я. ПРАКОП'ЕЎ, Л. ПРОКША і І. КАСПЯРОВІЧ.

ДА 150-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. В. ГОГАЛЯ

Вялікі пісьменнік зямлі рускай

МІКАЛАЙ ВАСІЛЬЕВІЧ ГОГАЛЬ адзін з буйных рускіх нацыянальных геніяў.

Ужо ў юнацкія гады Гогаль сутыкаецца з сацыяльнай несправядлівасцю. Ён быў не толькі сведкай, але і ўдзельнікам выбухнуўшай у нежынскай гімназіі буйнай палітычнай падзеі—так званай «справы аб вольнадумстве», у выніку якой з гімназіі выгналі шэраг прагрэсіўна настроеных прафесараў. Адгалоскамі нежынскай справы прасякнута цудоўнае пісьмо Гогаля да свайго родзіча П. П. Касяроўскага, у якім ён піша аб сваім рашэнні «зрабіць жыццё сваё патрэбным для карысці дзяржавы». У гэтым жа пісьме юнак выказвае «трывожныя думкі»—на конт таго, што яму становяцца ўпоперак дарогі».

Пасля заканчэння нежынскага ліцэя Гогаль едзе ў Петраград. Яго грамадзянскі пафас, узвышаныя мары сутыкаюцца з прыгоннай сапраўднасцю.

У сваіх творчых пошуках Гогаль звярнуўся да вельмі добра вядомага яму народнага жыцця, да украінскай вёскі. Народнае жыццё было тады ў цэнтры ўвагі перадавых людзей часу. Калі Гогаль ад горычы, ад цяжару сваіх расчараванняў звярнуўся да народнага жыцця, расказаў аб невычарпальнай сіле народа, пра яго велізарныя магчымасці, ён быў заўважаны Пушкіным. Скончылася пара творчага адзіноцтва.

Шырокая літаратурная вядомасць Гогаля пачалася пасля выхаду ў свет «Вечароў на хутары ля Дзіканькі». У «Вечарах» багаты і шматгранны народны гумар. Гогаль дабрадушна смяецца над самой фантазіяй казкі, над капрызнасцю і асаблівасцю яе форм, і, разам з тым, ён смяецца над тымі, хто не верыць праўдзе казкі,—над людзьмі духоўна беднымі, абмежаванымі. Пушкін высока ацаніў «Вечары на хутары ля Дзіканькі». Успамінаючы аб уражаннях, якія выклікала гэта кніга пры сваім паяўленні,

ён пісаў: «Як здзівіліся мы рускай кнізе, якая прымушала нас смяяцца, нас, што не смяяліся з часу Фанвізіна».

У пачатку 1835 года выйшаў новы зборнік аповесцей Гогаля —«Міргарад». «Аповесці, што служаць працягам «Вечароў на хутары ля Дзіканькі» — такі падзагаловак «Міргараду». Але гэта кніга была не проста працягам «Вечароў». Сваім зместам і характэрнымі асаблівасцямі стыля яна адкрывала новы этап у творчым развіцці пісьменніка.

У «Міргарадзе» Гогаль выступіў перад чытачамі, як мастак, што адкрыта і гнеўна ставіць важныя пытанні жыцця, смела ўскрывае сацыяльныя супярэчнасці.

ЗНАТХНЕННЕМ працаваў Гогаль над «Тарасам Бульбай». У велічнай барацьбе украінскага народа за сваё вызваленне ён знайшоў тыя гераічныя характары, аб якіх марыў і для якіх у акружаючых абставінах ён не бачыў рэальнага прататыпа.

Аповесцю «Тарас Бульба» Гогаль супроцьпаставіў свету пошласці свет узвышаных пачуццяў. Прыцягальнасць герояў «Тараса Бульбы», маральная прыгажосць іх патрыятычнага подзвігу, веліч нацыянальных і грамадскіх ідэалаў—усё гэта не магло не выступіць рэзкім кантрастам з сучаснай пісьменніку рэчаіснасцю.

У зборніку «Міргарад» вызначылася галоўная рыса рэалістычнага таленту Гогаля: яго незвычайнае адчуванне важнейшых праблем рускай рэчаіснасці. Рэакцыйная крытыка папракала Гогаля за тое, што ён быццам бы імкнецца паказаць «брудныя» бакі рускай рэчаіснасці. Яна не жадала бачыць наватарскі характар гогалеўскіх аповесцяў. Гогалю ставілі ў прыклад Марлінскага. Паводле П. Аненскага, Гогаль быў зусім адзінокім у творчых шуканнях, без сяброў, без прыхільнікаў. У гэты час Бялінскі абнародаваў свой артыкул «Аб рускай аповесці і аповесцях М. Гогаля», дзе ён выступае супроць ілжывай тэндэнцыі прыкрасіць жыццё. Вялікі крытык гаворыць, што паэзія павінна паказваць жыццё «як бы на пазор ва ўсёй яе нагаце», ва ўсёй яе жахлівай агіднасці.

РАННІЯ творы Гогаля былі падцвярджэннем тэарэтычных паняццяў Бялінскага аб рэалізме і народнасці. Яго барацьба за Гогаля была ўпартай і гарачай. Сваім артыкулам «Аб рускай аповесці і аповесцях М. Гогаля» В. Бялінскі імкнуўся не толькі раскрыць для чытача значэнне творчасці Гогаля, але і дапамагчы самому пісьменніку зразумець вялікі сэнс сваіх твораў.

У 1836 годзе выйшаў у свет «Рэвізор». Па словах Герцэна Гогаль у «Рэвізоры» «бязлітасна ўнікаў у самыя пацаемныя шчыліны нячыстай, злобнай чыноўнічай душы». У камедыі гутарка ідзе не аб жыцці аднаго ўяздного горада, а аб усёй чыноўніцка-бюракратычнай Расіі.

Пасля першага прадстаўлення камедыі «Рэвізор» рэакцыйная крытыка пачала нечуванную свістапляску вакол імя Гогаля. Рэакцыя імкнулася скампраментаваць п'есу, загарадзіць тэатр ад пранікнення на сцэну сацыяльна-аблічальных пастановак.

Яшчэ большым поспехам карысталіся ў перадавых колах «Мёртвыя душы». Бялінскі ацаніў паэму Гогаля «Мёртвыя душы» як твор «сацыяльны, грамадскі і гістарычны».

Гогаль паважаў гордага і смелага, усёперамагаючага чалавека. Пісьменнік хацеў, каб чалавека цанілі не па чыну, а па яго ўнутранай годнасці. Гэтай тэме прысвечаны яго аповесці «Шынель», «Нос» і іншыя.

У аповесцях «Неўскі праспект», «Партрэт» Гогаль бічуе сілай сваёй сатыры буржуазны свет, дзе ўсё падпарадкавана згублівай уладзе грошай. Сатыра Гогаля насіла жыццёсцвярджальны характар. Яго смех праз слёзы сведчыць не толькі аб смутку пісьменніка, аб яго адмаўленні і абурэнні. Перадавыя людзі Расіі бачылі ў сатыры Гогаля любоў да народа і сцвярджэнне новых асноў жыцця. За воблікам панскай, прыгонніцкай Расіі Гогаль бачыў хаця яшчэ і скаваную, але магутную сілу Радзімы, яе народа.

АЛЕ, ЯК ВЯДОМА, светапогляду Гогаля былі ўласцівыя некаторыя супярэчнасці. Так, у «Выбраных месцах перапіскі з сябрамі» Гогаль спрабаваў адмовіцца ад выбранага шляху пісьменніка-рэаліста. Бялінскі ў сваім «Пісьме да Гогаля» з уласцівай яму палкасцю бічаваў пісьменніка за гэтую спробу здрадзіць справе народа. Усё ж Гогаль для нас быў, ёсць і застанецца вялікім пісьменнікам зямлі рускай, таленавітым сатырыкам, палымяным патрыётам, імя якога заўсёды будуць помніць удзячныя патомкі.

Р. ПАІНА,
кандыдат філалагічных навук.

Віншуем Вас, Міхаіл Міхайлавіч!

27-га сакавіка споўнілася 50 год з дня нараджэння і 25 год навукова-педагагічнай дзейнасці аднаго з віднейшых прадстаўнікоў хімічнай навукі Беларусі Міхаіла Міхайлавіча Паўлючэнкі—члена-карэспандэнта АН БССР і дырэктара яе інстытута агульнай і неарганічнай хіміі, загадчыка кафедрай фізічнай і калоіднай хіміі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Асноўным напрамкам сваіх даследаванняў М. М. Паўлючэнка выбраў кінетыку абшырнага класу хімічных рэакцый з удзелам цвёрдых цел, якія ляжаць у аснове такіх важных працэсаў, як металургія, метала апрацоўка, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў.

У выніку сваіх шматгадовых даследаванняў, па якім надрукавана больш 80 работ і абаронена доктарская дысертацыя, М. М. Паўлючэнкам распрацавана новая арыгінальная тэорыя механізму цвёрдафазных рэакцый.

Асабліва важнымі ў практычных адносінах з'яўляюцца даследаванні М. М. Паўлючэнкі і яго супрацоўнікаў над працэсамі павярховага серанасычэння чыгунных і стальных вырабаў з мэтай павышэння іх зносаўстойлівасці і ўстойлівасці супроць карозіі, якія ўжо шмат год вядуцца ў цесным кантакце з вялікімі машынабудаўнічымі заводамі рэспублікі і маскоўскім заводам імя Ліхачова.

Цяпер пад кіраўніцтвам М. М. Паўлючэнкі распрацоўваюцца тэарэтычныя асновы новага метаду абагачэння калійных солей, на якім будуць базіравацца тэхналагічныя працэсы Старобінскага камбіната.

М. М. Паўлючэнка не толькі вялікі вучоны, але і таленавіты арганізатар і актыўны грамадскі дзеяч. Ён адным з першых пачаў прымяняць на тэрыторыі Беларусі спектральна-хімічныя даследаванні, арганізаваў узначальваемую ім радыяхімічную лабараторыю ва універсітэце, лабараторыю мінеральных солей і ўгнаенняў Акадэміі Навук БССР.

Сваё 50-годдзе і 25-годдзе навукова-педагагічнай дзейнасці Міхаіл Міхайлавіч сустракае ў росквіце сіл і здольнасцей.

Пажадаем яму ў гэты дзень доўгіх год здароўя і паспяховага завяршэння многіх творчых задум на карысць любімай навукі, на карысць народа.

А. БАРКАН, дацэнт.

Гогалеўскія традыцыі ў беларускай літаратуры

НЕЎМІРУЧАСЦЬ творчасці М. В. Гогаля заключаецца ў яе глыбокай народнасці, рэалізме і патрыятызме. У лепшых сваіх творах Гогаль выразіў магутны дух вялікага рускага народа, адлюстраваў яго гнеўны пратэст супроць самадзяржаўна-прыгонніцкага рэжыму.

Слаўныя традыцыі і лепшыя рысы класічнай літаратуры XIX стагоддзя—крытычнага рэалізма, глыбокай народнасці, высокай ідэйнасці і дэмакратычнага патрыятызма — развіваліся ў беларускай дарэвалюцыйнай літаратуры асноўнымі творамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі, Янкі Лучыны, Адама Гурыновіча, Змітрока Бядулі.

Яшчэ на зары развіцця беларускай дэмакратычнай літаратуры, у пачатку станаўлення ў ёй рэалізма і народнасці (30-я і 40-я гады XIX стагоддзя), можна бачыць яе цесную, арганічную сувязь з перадавой рускай літаратурай, з пушкінскімі і гогалеўскімі традыцыямі крытычнага рэалізма і народнасці. Аб гэтым красамоўна гавораць першыя помнікі пісьмовай беларускай дэмакратычнай літаратуры «Энэіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Ідэйнай асновай гэтых паэм з'яўляецца тая барацьба за праўдзівую, рэалістычную, народную літаратуру, якая вялася ў рускай літаратуры 30—40 гадоў XIX стагоддзя школай Гогаля.

Гогалеўская кампазіцыя «Вечароў на хутары ля Дзіканькі» адчуваецца ў аповесці Дуніна-Марцінкевіча «Вечарніцы», хоць паміж «Вечарамі» Гогаля і «Вечарніцамі» Дуніна-Марцінкевіча, як ліберальнага пісьменніка, ляжыць дыстанцыя вялікіх памераў, як у ідэйных, так і ў мастацкіх адносінах. І усё ж у агульнай кампазіцыі «Вечарніц» адчываецца ўплыў Гогаля. Гогалеўскія сатырычныя традыцыі выкрыцця бюракратычнага царскага суда, нікчэмнасці жыцця дробнага дваранства яскрава праяўляюцца ў арыгінальнай і самабытнай камедыі Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта». Тут Дунін-Марцінкевіч не тэхнічна, а творча выкарыстаў асобныя мастацкія прыёмы гумарыстычнай і сатырычнай характарыстыкі вобразаў бессмяротнага твора Н. В. Гогаля «Аповесць аб тым, як пасварыўся Іван Іванавіч з Іванам Нікіфаравічам».

ГОГАЛЬ любіў вусную народную творчасць, міфалогію. Ён першы з рускіх пісьменнікаў даў дасканалую мастацкую апрацоўку многіх народных апавяданняў, легенд, казак.

Гэтую гогалеўскую рысу пасля развівалі многія пісьменнікі. Францішак Багушэвіч таксама аддаў ёй даніну. Ён, услед за Гогалем і ў яго духу, апрацоўваў народныя паданні. Неабходна падкрэсліць, што Багушэвіч у сваёй апрацоўцы фантастычных народных паданняў нікольк не паўтарае Гогаля. Яго апрацоўкі з'яўляюцца арыгінальнымі і самабытнымі, нягледзячы на тое, што ў іх прысутнічае гогалеўская манера мастацкай характарыстыкі.

ТРАДЫЦЫІ Гогаля, а таксама асобныя гогалеўскія прыёмы мастацкай характарыстыкі і будовы вобраза плённа развіваліся ў беларускай літаратуры асабліва ў перыяд уздыму вызваленчага руху, выкліканага рэвалюцыяй 1905—1907 гг. Найбольш яскрава гэта прыкметна на творчасці такіх беларускіх пісьменнікаў, як Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля.

Пры ўсёй арыгінальнасці і самабытнасці камедый Янкі Купалы «Паўлінка» і «Прымакі» у іх мастацкай фактуры, у народнасці і рэалізме, у выкарыстанні асноўных сродкаў, у знешчальнай характарыстыцы кансерватыўнай засцянковай шляхты прыкметны ўплыў Гогаля. Гэты ўплыў праяўляецца тут не як перайманне або запазычанне, а як творчае развіццё беларускім пісьменнікам сатырычнай манеры Гогаля.

Вялікую ўвагу развіццю лепшых гогалеўскіх традыцый у беларускай літаратуры аддаваў Якуб Колас. Стыль Гогаля вельмі падабаўся Якубу Коласу, ён называў гэты стыль магутным. І калі Якуб Колас рабіў першую спробу пяра ў галіне працы, ён знаходзіўся пад моцным уплывам М. В. Гогаля. Аб гэтым красамоўна сведчыць першы празаічны твор Якуба Коласа «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле», рукапіс якога знойдзены ў бібліятэцы Вільнюскага універсітэта.

Я. Колас не толькі наследаваў мастацкія традыцыі Гогаля, але і развіваў іх далей, паглыбляючы гэтым самабытнасць не толькі сваёй творчасці, але і ўсёй беларускай літаратуры. Гэта праявілася перш за ўсё ў арганічнай сувязі беларускага пісьменніка з жыццём свайго народа, сваёй радзімы, у палымяным патрыятызме, у глыбокай народнасці апісання жыцця, быту, нацыянальных звычаяў простых людзей нашага краю; у выкарыстанні багацця народнай мовы, народнага гумару і сатыры пры паказе адмоўных бакоў у жыцці вёскі, старой інтэлігенцыі, дробных чыноўнікаў і інш.

Змітрок Бядуля таксама многаму вучыўся ў Гогаля. Уплыў Гогаля на творчасць Змітрака Бядулі прыкметны перш за ўсё ў такіх дарэвалюцыйных апавяданнях, як «Лявоніха і Сымоніха», «Як у біблії», «Пяць лыжак заціркі», «Панас на небе», «Тулягі» і інш.

У САВЕЦКІ час гогалеўскія традыцыі развіваліся беларускімі пісьменнікамі. Сярод іх асабліва вылучаюцца Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Міхась Лынькоў, Кузьма Чорны, Змітрок Бядуля. Творчасць геніяльнага рускага пісьменніка М. В. Гогаля адыграла вялікую ролю ў справе ўмацавання ў беларускай перадавой літаратуры традыцый крытычнага рэалізма, патрыятызма, народнасці, высокай ідэйнасці.

У савецкую эпоху на аснове ідэй вялікай партыі Леніна, на аснове сацыялістычнага рэалізма нашы пісьменнікі наследуюць усё лепшае з мінулай літаратурнай спадчыны, сярод якой адно з першых месц належыць М. В. Гогалю.

М. Р. ЛАРЧАНКА,
прафесар, доктар філалагічных навук.

ВЕРШЫ ІГАРА ЖУЛЕГІ

РОДИНЕ

Нет.
Ни на что тебя не променяю
Дороже жизни мне
твои черты,
Я чутким сердцем сына
Понимаю,
Как хороша и как прекрасна
ты.

Мне близок и понятен
Шум дубравы
И легкое дыханье ветерка.
Земля моя,
Овеянная славой,
Как все-таки ты сердцу
дорога.

Ігар Жулега нарадзіўся ў 1938 годзе. З 1957 года займаецца на рускім аддзяленні філалагічнага факультэта нашага універсітэта.

Ігар Жулега піша вершы. З некаторымі з іх мы знаёмім чытачоў.

ЗЕМЛЯ

Ни гор крутых,
Ни водопадов.
Как мозоли, видны на ней
Окопы, лунки от снарядов,
Напоминая о войне...
Но и другое
Видно тоже:
На месте топи и болот,
Во всей красе своей
пригожей,
Пшеница дивная растет.
Своей любви я
не скрываю.
И в сердце
гордых чувств струя.
Земля,
до жгучих слёз родная,
Земля,
до жгучих слёз своя.

Не завидую Вам...

Вы не знаете разве
Как пахнет полынь?
Как сгорает закат
И беснуется ветер?
Как над степью разносится
Птичье: «тинь-тинь»...
И как беркут летит,
Себе жертву наметив.
Вы не жили в палатке?
Не видели степь?
Не ходили по ней?
Не сидели за жаткой
И не знаете, вкусен
Как всё-таки хлеб,
Если подан на стол он
К дымящимся щам...
Откровенно скажу
Не завидую Вам..

ДРОВА

Захватывает дух
Эх, ну и ну.
Мороз!
Железо тронь—
и обожжёшься,
И я на ноги валенки
тяну,
Теперь без них—
Никак не обойдёшься.

И выхожу во двор
Лежат дрова,
Беру топор
И... раз-два, раз-два...
Потом прошибло,
Рубашка взмокла,
Снял рукавицы...
Нет, очень правильная
поговорка,
В которой мастера
Дело боится.
Нипочём холод,
Мороз нипочём.
Куй железо
Пока горячо...

Сосед глядит:
Расходился парень,
«Эх, и горячая, видно,
кровь»...
И вдруг неожиданно:
—Дай ударю,
Подсоблю наколоть
По-соседски дров.

Полушубок скинул,
Поплевал на руки.
Попросил: «Потолще
плашку подбрось».
И, крякнув,
Так молодецки ухнул,
Что полетели
Поленья врозь...

Я вижу: пришлась
По душе работа.
Говорят об этом
Яснее слов
На лбу солёные капли
пота
И гора нарубленных
дров.

ЧЫГУНАЧНЫ СКВЕРЫК У САКАВІКУ.

ЛЮБІМЫ АДПАЧЫНАК

Празвінеў апошні званок. Прасторныя калідоры вучэбнага корпуса філалагічнага факультэта ажылі ад шматгалосага гулу. Але на гэты раз студэнты не спяшаюцца да раздзявалкі, і там ужо няма такой мітусні, якая бывае звычайна.

Не прайшло і дзесяці мінут, як актавую залу запоўнілі любіцелі музыкі. Сёння тут чарговая лекцыя-канцэрт універсітэта музычнай культуры.

Перш чым выканаць той ці іншы твор, лектар Л. Ауэрбах знаёміць слухачоў з творчасцю кампазітара, расказвае змест асобных музычных твораў. Як правіла, сваё тлумачэнне лектар суправаджае музычнымі прыкладамі. Гэта дапамагае слухачам глыбей разумець музыку.

На гэты раз выконвалася «Сімфанічная паэма «Прэлюдыі» Ліста і «Фантастычная сімфонія» Берліоза.

...Узмах смычка—і чаруючыя гукі Ліста паліліся са сцэны. Зала замерла. І чым далей развіваецца музычнае дзеянне, тым часцей мяняюцца твары студэнтаў: то яны вясёлыя і радасныя, то ўраз задумлівыя. Не, зусім не трэба валодаць багатай фантазіяй і нейкім асобым дараваннем, каб разумець свет гукаў.

Але вось замірае апошні плач скрыпкі. Нейкае імгненне пануе паўнейшая цішыня, але затым зала расколваецца ад грому апладысментаў. Слухачы шчыра ўзнагароджваюць выканаўцаў.

Музычны лекторый ва універсітэце працуе з лістапада мінулага года. За гэты час студэнты пазнаёміліся з творамі Шастаковіча і Хачатурана, Пракоф'ева і Кабалеўскага, а таксама з музыкай беларускіх кампазітараў. З рускіх і замежных класікаў былі выкананы творы Чайкоўскага, Рымскага-Корсакава, Глазунова, Бетховена, Мендэльсона і інш. Пасля заканчэння цыкла лекцый-канцэртаў адбудзецца падагульняючая канферэнцыя слухачоў.

Я. ПРАКОП'ЕЎ

НАША САМАДЗЕЙНАСЦЬ

ДАРОГАЙ МАЙСТЭРСТВА

АПОШНІЯ ГУКІ ПАТАНУЛІ ў гарачых апладысментах, і толькі апусціўся занавес, удзельнікі секстэта домр з віншаваннямі кінуліся адзін да другога. А калі Жыхараў сказаў, што іх калектыў адзін з лепшых камерных калектываў Беларусі, які з поспехам можа супернічаць нават з прафесіянальнымі артыстамі, яны былі ўпэўнены, што чэсць роднага Мінска, прадстаўнікамі якога выступалі на Дэкадзе самадзейнага мастацтва ў гонар 40-годдзя БССР, абаронена.

—Дзякуем вам, дарагі Міхаіл Аркадзьевіч, — звярнулася ад імя сяброў да свайго кіраўніка Лера Налівайка,—за тое, што вы навучылі нас сапраўднаму майстэрству.

— Вы атрымалі грамату, вам і падзяка,—сціпла адказаў ён.

Помніцца, як няўпэўненыя першакурснікі амаль 3 гады назад прышлі ўпершыню на рэпетыцыю аркестра. Жаданне іграць па-сапраўднаму заахвочвала працаваць і працаваць. Неўзабаве, заўважыўшы іх настойлівасць, мастацкі кіраўнік аркестрам М. А. Лісіцын прапанаваў ім займацца паралельна і ў секстэце домр. Так нарадзіўся зладжаны таленавіты калектыў. З яшчэ большым натхненнем і ўпартасцю аваскай гаспадаркі Дзяржынскага раёна.

У рэпертуары секстэта — «Чардаш» Монці і Венгерскі танец «№ 5» Брамса, вальс Гуно з оперы «Фауст» і «Жартоўная» Камінскага, творы Грыга, Іагана Штрауса і многія іншыя.

За выступленне на рэспубліканскім фестывалі моладзі ў 1957 годзе ў горадзе Мінску секстэт домр быў узнагароджаны Дыпломам першай ступені.

—Сваімі поспехамі мы абавязаны. перш за ўсё дружбе,—зауважае Тоня Тарасевіч,—яна дапамагае нам не толькі займацца ў гуртку, але і добра вучыцца. Наша Лера Налівайка атрымоўвае іменную стыпендыю, Толя Рубінаў—выдатнік.

—Не адстае ад іх і Тарасевіч,—дадае з усмешкай Эдуард Садоўнічы,—да тагож і ў хоры факультэцкім саліруе.

Ды хіба ж можна дрэнна вучыцца, дрэнным быць у паводзінах, калі лёс кожнага гурткоўца хвалюе яго таварышаў! Вось толькі што скончыліся заняткі, і ўсе яны накіроўваюцца ў вучэбны корпус, дзе ў гэты час Антон Паклонскі павінен здаваць экзамен. І як прыемна адчуваць на сабе клопаты сяброў, нават тады, калі яны не вельмі лагодныя.

—Хоць, кажуць, адзіночкі не робяць гісторыі, але калі мы і заслугоўваем увагі, то ў гісторыі нашага гуртка не малое месца належыць Міхаілу Аркадзьевічу Лісіцыну, які, акрамя секстэта, кіруе квартэтам баяністаў, інструментальным квартэтам і аркестрам, зарэкамендаваўшымі сябе здольнымі, падрыхтаванымі калектывамі,—гаворыць Лена Меляшкевіч.

Л. МАЛІНОЎСКІ.

На здымку: секстэт домр у час рэпетыцыі (злева направа) Толя Рубінаў, Лена Меляшкевіч, Антон Паклонскі, Эдуард Садоўнічы, Тоня Тарасевіч і Лера Налівайка.

ІХ НОРАВЫ

СВЯТЫ БАРНАБАС І РОК-Н-РОЛ...

Доўга ДЖ Бюмон, свяшчэннік царквы святога Барнабаса (Лондан) ламаў галаву над тым, як прыцягнуць увагу сваёй паствы да пропаведзяў, як зрабіць так, каб маладыя англічане часцей наведвалі царкву. І раптам яго асяніла геніяльная ідэя: чаму б не прыбегнуць да дапамогі рок-н-рола?

Аднойчы Бюмон зайшоў на амвон, прачытаў звычайную пропаведзь аб чыстаце веры, аб маралі, а затым, да здзіўлення прысутных, выкрыкнуў: «А'кей, Гары! Валяй рок!» І вось пад самыя скляпенні царквы панесліся душараздзіраючыя гукі апошняй «музычнай» навінкі пад назвай «Залаты век».

Распаліўшыся, Бюмон патрабаваў зайграць яшчэ адзін «рок» —«Вось пачынаецца патрасаючая гісторыя», напісаны не кім іншым, як ...мясцовым вікарыем!

Англійская газета «Дэйлі мірор», якая паведаміла чытачам аб гэтай з'яве, не гаворыць, што было далей.

«Дэйлі мірор», мабыць, палічыла нетактычным пісаць аб гэтым. Але яна яўна адабрае ідэю Бюмона. Яшчэ зусім нядаўна гэта газета са смуткам адзначала, што аўтарытэт царквы ў Англіі, і асабліва сярод моладзі, падае. Тады яна заклікала царкоўнікаў перагледзець свае «метады працы», і вось цяпер Бюмон, бачна, уняў парадам «Дэйлі мірор».

Мабыць, наступным яго крокам будзе закупка партыі амерыканскіх гангстэрскіх фільмаў, каб паказаць іх пасля абедні.

Л. КУЗНЯЦОЎ.
(«Камсамольская праўда»)

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 03122 Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна Тыраж 2000 экз. Зак. 385.